УДК 398(476.2):81'373.213

С. А. Вяргеенка

# Тапонім гары ў лекавых замовах

У артыкуле аналізуюцца тэксты лекавых замоў, у якіх у якасці першаснага локуса выступае Сіянская гара, трансфармацыя хрысціянскага тапоніма гары Сіён. Адзначаецца, што ў замовах часта сустракаюцца рэмінісцэнцыі на біблейскія сюжэты, на Сіянскай гары дзейнічае пэўнае кола персанажаў, у асноўным хрысціянскіх, што і вызначае дадзены локус як станоўчы, які здольны аказаць дапамогу ў лячэнні ад розных хвароб.

Лекавыя замовы – гэта фальклорныя творы, правільнае выкарыстанне якіх, паводле міфалагічных уяўленняў беларусаў-палешукоў, павінна садзейнічаць паляпшэнню фізічнага стану чалавека. І на канчатковы вынік «працуе» ўвесь комплекс персанажна-вобразнага, локуснага, атрыбутыўнага свету. Названыя кампаненты з'яўляюцца і складнікамі замоўных матываў, сярод якіх адным з найбольш папулярных можна назваць міжфункцыянальны матыў «Міфалагічны цэнтр, на якім адбываецца асноўнай дзеянне», распаўсюджанасць якога тлумачыцца тым, што «пераносам дзеяння ў сакральную прастору… забяспечваецца магчымасць вырашэння крытычнай сітуацыі, якая з'явілася прычынай звароту да замовы» [1, с. 157].

Локусы, на якіх адбываецца асноўнае дзеянне галоўнай дзеючай асобы, у межах названага вышэй матыву падзяляюцца на дзве групы: першасныя і другасныя. З міфа-паэтычнай прасторай першасных локусаў, акрамя такіх як мора, востраў і г.д., звязана і гара. Варта адзначыць, што «на зямлі магічны цэнтр сусвету асацыіраваўся з … вобразам святой гары (слупа, сусветнай калоны, сусветнай восі), які быў «сваім» у кожнага народа» [2, с. 34], таму горы і ўяўляліся як «найлепшыя месцы для выканання культа» [3, с. 73]. У хрысціянскай рэлігіі адным з папулярных тапонімаў з'яўляецца гара Сіён, што знаходзіцца на паўднёвым захадзе ад Іерусаліма. Гэта геаграфічная акалічнасць адлюстравана і ў Бібліі: «Прекрасная возвышенность, радость всей земли гора Сион; на северной стороне ее город великого Царя, Бог в жилищах его ведом, как заступник» [Псалтыр **48** 3–4]. Названая гара, паводле Свяшчэннага Пісання, з'яўляецца і месцам жыхарства Бога: «Пойте Господу, живущему на Сионе» [Псалтыр **9** 12] або «Ибо избрал Господь Сион; возжелал (его) в жилище себе» [Псалтыр **132** 13]. З пэўнай доляй верагоднасці можна гаварыць аб трансфармацыі ў народнай традыцыі назвы гэтай гары ў «Сіянскую гару». Матыў «Міфалагічны цэнтр, на якім адбываецца асноўнай дзеянне» з тапонімам «Сіянская гара» ў якасці акалічнасці выконвае ў замоўным тэксце сюжэтаўтваральную функцыю. У межах гэтага матыву суб'ектамі, якія выконваюць асноўнае дзеянне на Сіянскай гары, часцей за ўсё выступаюць Прачыстая Маці і Ісус Хрыстос: «Ішла Матка Прачыстая па Сіянскай гарэ, святую воду насіла…» («Ад рожы» [7, с. 218, № 728]); «на Сиянской горе, на братаньской земле Божья Мати ходила…» («Облегчение родов» [1, с. 24, № 1]); «ехаў Ісус Хрыстос на сівым кані па Сіянскай гары» («Ад звіху-ўдару» [7, с. 173, № 566]); «ехаў Ісус Хрыстос з Сіянскай гары на сваім кані цераз огненную раку, цераз драцяны мост» («Ад звіху» [9, с. 138, № 555]); «ехав Ісус Хрістос на Сіянскую гору на вороном коне, на золотом седле, на шолковом шнуре» («Грызь, параліч, звіх» [9, с. 199, № 821]). Адзначым, што ў іншых тэматычных групах у якасці суб'ектаў выступаюць і іншыя святыя. Напрыклад, у замове «Ад гадзюкі» «Архангел Михаил на горе Сиянской громом забье…» [1, с. 375, № 674], а ў замове «Приговор корове, если корову сглазят» «ехал Илья Пророк по Сиянской горе, по шелковой траве с золотым крестом через золотой мост» [1, с. 470, № 809].

Сіянская гара з'яўляецца сакральным цэнтрам, на якім дзейнічае і замаўляльнік. Невыпадкова ў замове ён выходзіць на Сіянскую гару, дзе сустракаецца з «прыстрэкам» і

адсылае яго з чалавека. У якасці сведкі і памочніка выбіраецца сонца – «у хрысціянстве – сімвал Бога і слова Божага…» [3, с. 403]. У каментарыі да замовы інфарматар удакладніла, што маліцца трэба «перад сонцам, штоб яно не зайшло» [4, с. 25]. Менавіта так пастуліруецца час, які можна вызначыць як найбольш удалы для замаўлення. Тэмпаральны код становіцца вызначальным і ў замове «Ночнэ шэпчуць», запісанай у в. Стадолічы Лельчыцкага раёна, і пераканаўча сведчыць аб тым, што старажытная язычніцкая сістэма абмежаванняў звязана была з днямі, датамі, часам пэўных дзеянняў і работ. У Чысты чацвер Прачыстая Маці ішла «на Сиянскую гору траву жаци. Жала, и ужынала, и качивала с (имя) раба Божа(г)о дзецинство зганяла» [1, с. 60, № 65]. Да гэтага часу мяркуюць, што пазбаўленне ад хваробы менавіта ў Чысты чацвер павінна забяспечыць чалавека здароўем. «У народным асяроддзі ідэя духоўнага і фізічнага ачышчэння знайшла адлюстраванне ў мностве бытавых дзеянняў і абрадаў ачышчальнага характару» [5, с. 767].

Сіянская гара – гэта месца, на якім дзеянні суб’ектаў (персанажаў як хрысціянскіх, так і язычніцкіх) носяць ачышчальны і ўзнаўляльны характар. Так, Прачыстая Маці на Сіянскай гарэ змывала святой вадой з раба божага «балячку свярбючую, калючую, балючую…» [7, с. 218, № 728], «на Сияньской горе, на шелковой траве … думала-гадала и книжку читала, с хрэшчэного (имярек) ляк выговорала, вымовляла…» [1, с. 122, № 177], за ёю беглі тры харты, адзін з якіх «слёзы злізаў, другі бег – таму злізаў, а трэці бег – бяльмо злізаў і з сабою ўзяў» [6, с. 152, № 393]. Ідучы з «Асіянскіх гор», тры дзеўкі знайшлі іголку і шаўкову нітку, каб «зашыць» рану і «рабу божаму (імя) кроў замаўляці» [4, с. 33]. У замове «Ад рожы», запісанай у в. Серабранка Рагачоўскага раёна, «свят Бог» ішоў па Сіянскай гарэ, дзе стаяў «стары старык» і трымаў у руцэ тры рожы, адна з якіх «у ваду ўпала, другая ў вагне згарэла, а трэцяя ў руцэ самлела» [6, с. 129, № 305].

У замовах, асабліва тых, дзе асноўным локусам з’яўляецца Сіянская гара, часта сустракаюцца рэмінісцэнцыі на біблейскія сюжэты. Так, у Евангеллі ад Матфея **17** 1-2 апісанаператварэнне («преображение») Ісуса Хрыста на гары, куды ён прыйшоў разам з Пятром, Іакавам і Іаанам: «… взял Иисус Петра, Иакова и Иоанна… и возвел на гору высокую одних. И преобразился пред ними: и просияло лице Его, как солнце, одежды сделались белыми, как свет», а ў замове «ішоў сам Гасподзь з Ісусам, з апосталамі на Сіянскую гару, на ярданскую ваду. Там Ісуса абмывалі, у господнюю рызу адзевалі…» [6, с. 183, № 491]. Сама гара ўяўляецца ў замовах месцам, якое здольна прынесці дапамогу: «Вы бярыце яе («балезнь злую, балючую, калючую, трасучую» – С.В.) ды нясіце ж яе на гару Сіянскую, на ваду арданскую, дзе Ісуса Хрыста абмывалі» [9, с. 57, № 155]. Пра падобную здольнасць чытаем і ў Біблії: «Да услышит тебя Господь в день печали … да пошлет тебе помощь из Святилища, и с Сиона да подкрепит тебя» [Псалтыр **20** 2–3].

Зрэдку Сіянская гара, а дакладней з’явы, якія там адбываюцца, могуць быць і небяспечнымі. Паводле народных уяўленняў, гара з’яўляецца адным з месцаў, дзе жыве вецер, які ў замовах часта асэнсоўваецца як прычына хваробы. У замове «Ад бяльма на воку», запісанай у в. Лебядзёўка Кармянскага раёна, буйныя вятры «запарушылі» вока Прачыстай Маці, якая гуляла па «Сіянскай гарэ» [9, с. 99, № 375].

Пры пабудове твораў замоўнага жанру выкарыстоўваецца прынцып ступянёвага звужэння, калі на адным, першасным, локусе ўзнікаюць іншыя, другасныя, локусы ці з’яўляюцца пэўныя аб’екты, якія і становяцца месцам асноўнага дзеяння. Найбольш папулярнымі сярод такіх аб’ектаў выступаюць царква, дрэвы і інш. З’яўленне ў замовах царквы на Сіянскай гары не выпадкова. Гэты факт – яшчэ адзін прыклад таго, як нашы продкі «прывівалі» хрысціянскія элементы да старажытнай язычніцкай асновы. Як адзначае У. Лапенкоў, «на Сіянскай гары быў дом Іаана Багаслова, і на гэтым месцы была створана вялікая царква» [10]. У замове «Для дзіцяці навароджанага», замаўляльнік выходзіць «на Сіянскую гору, на Сіянскай гары мураўка, на мураўцы царкоўка, а ў царкоўцы папы чытаюць, дзякі спяваюць» [11, с. 79, № 269], у замове «Ад чорнай балезні, ад прыпадку» «на Сіянскай гарэ, на святой зямле, на шаўковай траве стаяў гасподні храм на дванаццаць святых глаў, за дванаццаццю прастоламі» [9, с. 203, № 835]. Наяўнасць царквы на Сіянскай гары не

дазваляе варожым сілам не толькі выконваць пэўныя дзеянні, а нават трапіць туды. Так, у вышэйназванай замове, «чорнай балезні тут не стаяць, з дванаццаццюў руках не дзяржаць, дванаццаць евангелій не чытаць, дванаццаць херуімаў не скаваць» [9, с. 203, № 835]. У замове «След-нарадка», небяспечнай істотай, якая з'яўляецца прычынай хваробы, выступае «змея-колдовніца, змея-чаравніца». Для яе прыгатаваны розныя ўмовы, якія нельга выканаць, у тым ліку «следа ў (імя) не браць, на Сіянскую гору не взлетаць. На Сіянской горе стоіт собор-церква, на собор-церкву не ходзіць…» [9, с. 195–196, № 811].

У асноўнай частцы замоў на Сіянскай гары сустракаюцца і дрэвы, часцей за ўсё – дуб, адно з самых шануемых у славян дрэў, якое сімвалізуе сусветнае дрэва: «Нашы продкі суадносілі вобраз Сусветнага Дрэва, якое расло ў цэнтры Свету на востраве-выраі, часцей за ўсё з дубам. Нездарма ж у многіх тэкстах беларускіх замоў, асабліва ў замовах ад розных хвароб … гаворыцца пра дуб, які расце ў моры-акіяне на востраве…» [43, с. 61]. У межах прапанаванага артыкула нас у першую чаргу цікавіць дуб, які размежчаны на Сіянскай гары: «На Сіянскай гарэ стаіць дуб. На тым дубу дванаццаць какатоў, на тых какатах дванаццаць вараноў» [7, с. 337, № 1156]. Гэтае дрэва сустракаецца і ў замовах іншых тэматычных груп, у прыватнасці ахоўных: «Пайдзи на Сиянскую гору, там стайць цар-дуб» («Ад звера») [1, с. 531, № 907]. З прыведзеных прыкладаў мы бачым, што дуб – гэта дрэва прыгожае, моцнае, аднак, хаця дуб у славянскай традыцыі і «сімвалізуе сілу, моц і мужчынскі пачатак» [13, с. 141], у замовах ён можа мець і зусім супрацьлеглы выгляд: «На Сиянской гарэ стоиць дуб без голья, без лисцья, без корэня и без коры, и без сучья и без шчыка [без верхушки]» [1, с. 130, № 189]; «Выйду я за новыя вароты, гляну я на Сіянскую гару. На Сіянскай гарэ стаіць сухі дуб, на тым дубе сухое галлё, пад тым дубам ляжыць гроб» [9, с. 211, № 863]. У дадзеных прыкладах ён выступае «ў якасці памежнага локуса… » [2, с. 143–144] і тое, што пад дубам ляжыць гроб, падкрэслівае сувязь гэтага дрэва з царствам мёртвых. На такім дрэве прысутнічаюць і іншыя персанажы адпаведнага выгляду: «На том дубе седзиць пцица без крыл, без пирья, без ног, кипцов і без кишок, без голови, без дзюби [клюва] и без очэй» [1, с. 130, № 189].

Вобразы гары і дуба у некаторых выпадках маюць аднолькавую сімволіку: «Гара звязваецца з сусветнай воссю, дрэвам жыцця» [3, с. 73], на вяршыні сусветнага дрэва змяшчаюцца птушкі, якія з'яўляюцца «архетыпічным вобразам духа, душы… і выступаюць у якасці сімвала боскай сутнасці…» [3, с. 340–341]. Так, у замове «Ад уроку («ад плахога глаза»)» «Ляцеў птах па [Сіянскіх] гарах, сеў на (імя) варатах. Стаў шчабятаці, урокі сабіраці» [7, с. 290, № 977].

Такім чынам, мы прааналізавалі толькі некаторыя аспекты, звязаныя з тапонімам Сіянскай гары у лекавых замовах. Відавочна, што тэксты з названым локусам з'яўляюцца больш познімі па часе ўзнікнення, аднак у некаторых выпадках яскрава адчуваецца сувязь язычніцкай і хрысціянскай традыцый.

Літаратура

1 Полесские заговоры (в записях 1970–1990 гг.) / сост., подготовка текстов и коммент. Т.А. Агапкиной [и др.]. – М. : Издательство «Индрик», 2003. – 752 с.

2 Домников, С.Д. Мать-земля и Царь-город. Россия как традиционное общество / С.Д. Домников. – М. : Алетейа, 2002. – 672 с.

3 Словарь символов и знаков / авт.-сост. Н.Н. Рогалевич. – Мн. : Харвест, 2004. – 512 с.

4 Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Рэчыцкага раёна / укладанне, сістэматызацыя, тэксталагічная праца, уступныя артыкулы, рэдагаванне І.Ф. Штэйнера, В.С. Новак. – Мінск : ЛМФ «Нёман», 2002. – 383 с.

5 Русская мифология. Энциклопедия. – М. : Эксмо; СПб. : Мидгард, 2005. – 784 с.

6 Таямніцы замоўнага слова / уклад., сістэм. тэкстаў, уступны арт., каментарыі і рэдаг. І.Ф. Штэйнера, В.С. Новак. – Гомель : Беларускае Агенцтва навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 1997. – 320 с.

7 Замовы / уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г.А. Барташэвіч; рэдкал.: А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 597 с.

8 Крыніц кармянскіх пераразвоны (абрады і песні ў сучасных запісах) / укладанне, сістэматызацыя, тэксталагічная праца, уступны артыкул В.С. Новак; пад рэд. І.Ф. Штэйнера. – Гомель : Гомельскі цэнтр навукова-тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 2000. – 210 с.
9 «На моры-акіяне, на востраве Буяне…» (лекавыя замовы Гомельшчыны): фальклорна-этнаграфічны зборнік / С.А. Вяргеенка; пад рэд. В.С. Новак; М-ва адукацыі РБ, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2009. – 220 с.
10 Лапенков, В. История нетрадиционной ориентации. Легенды и мифы всемирной истории / В. Лапенков. – Режим доступа: http://www.e-reading-lib.org/book.php?book=1005386
11 Замовы / уклад.: У.А. Васілевіч, Л.М. Салавей; уступ. арт.: Л.М. Салавей. – Мінск : Беларусь, 2009. – 519 с.
12 Казакова, І.В. Сімволіка і семантыка славянскіх міфалагем (на матэрыялах беларускага фальклору) / І.В. Казакова // навук.рэд. А. С. Фядосік. – Мн. : «БОФФ», 1999. – 221 с.
13 Агапкина, Т.А. Дуб / Т.А. Агапкина // Славянские древности: этнолингвистический словарь в 5-ти томах. – Т. 2. – Д-К (крошки) – М. : Международные отношения, 1999. – С. 141–146.